ПАДЗЕЯ

# НА ЮБІЛЕЙНЫМ СВЯЦЕ

**МАЛАДЗЕЧНА. 13 чэрвеня дэлегацыя Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі ўзяла ўдзел у мерапрыемствах юбілейнага XXV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2026».**

Прадстаўнікі літаратурнай Гродзеншчыны, паэты Людміла Кебіч, Вольга Алізар і Дзмітрый Радзівончык сустрэліся з калегамі з Мінска і Цэнтральнага рэгіёну, наведалі Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы ў Вязынцы (В. С. Алізар), паўдзельнічалі ў паэтычна-песенным свяце «Жыццё і мары, і каханне» ў Палацы культуры г. Маладзечна, а таксама выступілі на прэзентацыі новай кнігі, калектыўнага зборніка «Багдановіча вечная зорка» ў Маладзечанскай цэнтральнай раённай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча да 135-годдзя з дня нараджэння паэта.

Сёлета свята мастацтва і творчасці ў Маладзечне 25-е па ліку, юбілейнае. Кожны год на фестывальных пляцоўках гучыць роднае паэтычнае слова. Гэта традыцыя, якую ўсімі сіламі падтрымліваюць улады, грамадскасць, сучасныя айчынныя літаратары. На жаль, інфармацыі пра паэтычную частку фестывалю значна менш, чым пра песеннае свята. Напэўна, такое становішча аб’ектыўна адлюстроўвае агульнанацыянальную тэндэнцыю зніжэння цікавасці да паэзіі. Тым не менш, справа захавання, узбагачэння літаратурных традыцый Беларусі, згодна з запаветамі класікаў, з’яўляецца святым абавязкам для кожнага з нас.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На здымках:** гродзенскія літаратары сярод удзельнікаў мерапрыемстваў юбілейнага XXV Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі «Маладзечна-2026». Мінская вобласць, 13 чэрвеня 2026 года.



**Член СПБ, гродзенская паэтэса Вольга Алізар – крайняя з правага боку**




XXV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Маладзечна-2026



**У гэтай хатцы нарадзіўся паэт, якога лічаць родным усе беларусы**










ЯНКА КУПАЛА




**Выступіць ля помніка Песняру – вялікі гонар**




**Рукапісы класіка і полымя купальскага вогнішча**




XXV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Маладзечна-2026







**Старшыня ГрАА СПБ, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, паэтэса Людміла Кебіч выступае на свяце «Жыццё і мары, і каханне» (вядучы Міхась Пазнякоў)**





**Член СПБ, гродзенскі паэт, публіцыст Дзмітрый Радзівончык у Маладзечне не ўпершыню**




**У інтэр'ерах Палаца культуры г. Маладзечна**



XXV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ

Мала93ечна·2026









XXV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ

Маладзечна-2026




XXV НАЦЫЯНАЛЬНЫ ФЕСТЫВАЛЬ БЕЛАРУСКАЙ ПЕСНІ І ПАЭЗІІ
Маладзечна-2026





**На прэзентацыі зборніка да юбілею Максіма Багдановіча ў бібліятэцы, якая носіць яго імя**




**Выступае Людміла Кебіч.**
**Вядучыя мерапрыемства Міхась Пазнякоў і Тамара Кавальчук**




**Выступае паэтэса з Гродна Вольга Алізар**




**Дзмітрый Радзівончык прадставіў сваё эсэ «Размова з Максімам»**





**Людміла Антонаўна Кебіч падарыла гаспадарам кнігі гродзенскіх аўтараў**



**Пасля мерапрыемства**






**Фота: Віктар ІВАНЧЫКАЎ**


XXV ЮБІЛЕЙНЫ
Мала93ечна-2026
XXV ЮБІЛЕЙНЫ
Мала93ечна-2026




**Фестывальны Маладзечна**

